# НАСТАЎНІК

У ГАЛЕРЭІ Ганаровых грамадзян нашага- горада, побач з партрэтамі маршала К. К. Ракасоўскага і ветэрана «Гомсельмаша» В. Р. Нарбутовіча, — партрэт школьнага настаўніка. Гэта Альбін Іванавіч Мілеўскі, настаўнік фізікі, заслужаны настаўнік рэспублікі. Усе трое — маршал, рабочы і настаўнік — першыя Ганаровыя грамадзяне Гомеля.

А. І. Мілеўскі, якому сёння споўнілася 60 год, даўно вызначаецца творчай індывідуальнасцю і вялікай педагагічнай таленавітасцю. Тым, каму выпала шчасце быць яго вучнямі і таварышамі па працы, урокі Мілеўскага, яго нястрымная фантазія і яго высокая культура заўсёды будуць дапамагаць пры вырашэнні самых адказных жыццёвых задач.

У далёкія трыццатыя гады група энтузіястаў пры гарадскім радыёцэнтры (сярод іх быў яшчэ зусім малады Мілеўскі) пасля напружапай працы здолела прыняць першы ў Гомелі сеанс тэлебачання. Прыняць на экран, уманціраваны ў... звычайную лямпачку. МілеўскІ ўспамінае гэтых энтузіястаў, улюбёных, як і ён, у фізіку і тэхніку: якія светлыя галовы трэба было мець, каб амаль 45 год назад, калі і радыёрэпрадуктары былі не ў кожным доме, зманціраваць дзеючы тэлевізійны прыёмнік!

Педагагічная дзейнасць А. І. Мілеўскага пачалася ў рабфаку. Яго вучні — маладыя і немаладыя рабочыя гомельскіх заводаў. Прыходзілі пасля змены, у спяцоўках, садзіліся за парты, вучыліся з вялікім жаданнем. І фізіка была самым любімым іхнім прадметам! Здолеў. відаць, малады выпускнік Гомельскага педінстытута запаліць у іх цікавасць да сваёй навукі.

— Альбін Іванавіч. нягледзячы на сваю маладосць, — успамінае кадравы рабочы аўтарамзавода Д. Ф. Маршаў, былы рабфакавец. — быў для нас і цудоўным настаўнікам, і цудоўным таварышам. Колькім з нас даў ён пуцёўку ў жыццё!

Ды і сам Мілеўскі ўспамінае аб рабфакаўскім перыядзе з вялікай цеплынёй. Пройдуць гады, дзесяцігоддзі, і яго вучні, пастарэўшыя ўжо будуць шукаць настаўніка, будуць пісаць яму і гаварыць самыя добрыя словы, а адзін з рабфакаўцаў — Дзмітрый Кавалёў, стаўшы вядомым паэтам, прысвеціць яму некалькі сваіх вершаў. "

Потым была праца ў школе. А потым — Ленінградскі фронт, медаль «За адвагу» і ордэн Чырвонай зоркі, дні і ночы ў акопах, раненне, кантузія, хвароба... Зноў кантузія. І пасля вайны — Гомель.

— Ведаю вас, Альбін Іванавіч, як добрага выхавацеля, — сказаў яму тады Леў Сцяпанавіч Кужалеў, загадчык аддзела абкома партыі, — і буду рэкамендаваць дырэктарам дзіцячага дома ў Васільеўцы.

Паехаў у Васільеўку. Можна напісаць аповесць аб тым, як здабываліся ложкі і коўдры, як падбіраліся выхавацелі, як прымалі першых дзяцей. І як часам гэтыя рабяты, што прывыклі да «волі», уцякалі ад рэжыму, ад парадку. Усякае было...

Але справы наладзіліся. Праўда, прыбавілася сардэчнага болю, але Васільеўскі дзіцячы дом стаў адным з лепшых у рэспубліцы.

Аднойчы выклікалі Мілеўскага да начальства. Шчыра гаворачы, была думка, што прапануюць пайсці настаўнікам у школу.

А яму гавораць:

— Вырашылі даручыць вам пасаду загадчыка аддзела дзіцячых дамоў аблана.

І пачаліся паездкі па апаленай зямлі Гомельшчыны. Увесь час у шляху, у камандзіроўках: не хапае адзення. цяжка з харчаваннем, з жыллём, з дапаможнікамі... Як быць? Як выратаваць тысячы бяздомных дзяцей? Але ты ўжо маеш вопыт работы ў Васільеўцы. У цябе, хаця і хворае, але добрае сэрца, ты бачыў на вайне смерць, ведаеш цану жыццю. Ты вельмі строгі з тымі, ад каго залежыць многае, але якая добрая ў цябе ўсмешка, калі ты звяртаешся да дзяцей!

І на спадарожных машынах, пешшу па вясновым разводдзі ты наведваеш вёскі, разбураныя райцэнтры, робіш усё, каб ствараліся дзіцячыя дамы, інтэрнаты, каб асвяціліся радасцю дзіцячыя твары.

Пасля другога сардэчнага прыступу доўга ляжаў у бальніцы. Інваліднасць. Ледзь паправіўся — прапанавалі прыняць школу. Адмовіўся наадрэз. Пайшоў працаваць настаўнікам. І пачаўся тады, у 1951 годзе, той самы перыяд дзейнасці, які прывёў А. І. Мілеўскага ў лік самых цікавых настаўнікаў нашай рэспублікі.

Помніцца, прыйшла да мяне маладзенькая дзяўчына, інспектар, і сказала разгублена:

— Вы не гаварыце Альбіну Іванавічу, але я неяк разгубілася на яго ўроку ў дзевятым «Б» . Рабяты вольна звяртаюцца да яго. калі хочуць, ходзяць па класу, самі рыюцца ў шафах, у даведніках... Ды і ён не перад класам, а дзесьці збоку ці ў прэпаратарскай... Не ўрок, а дыскусія!

Цяпер, бадай, ніхто не здзівіцца і не рагубіцца на такім уроку, але тады, гадоў 15 назад, такая манера навучання далёка не ўсімі адабралася. А Мілеўскі добра разумеў, што фізіка немагчыма без пошукавай работы, і прывучваў дзяцей з шостага класа шукаць, здзіўляцца, радавацца самым маленькім адкрыццям. Яго любімыя выразы — «дакажыце», «паспрабуйце знайсці памылку», «а як вы лічыце?». Дарэчы, на «вы» — да ўсіх, незалежна ад узросту. Ад унутранай выхаванасці.

Урокі Мілеўскага вучылі дзяцей думаць, спрачацца, выхоўвалі ў іх тое, што называецца цікавасцю да ведаў. А якая ж гэта важная справа — выхаваць цікавасць да ведаў!

Альбін Іванавіч глыбока перакананы ў тым, што вучоны, сапраўдны інжынер, здольны ствараць, фарміруецца ў школе.

Так лічыць не толькі Альбін Іванавіч. Так лічаць і яго шматлікія вучні і паслядоўнікі, такія, скажам, як лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі БССР Анатоль Свірыдзёнак і Эдуард Канавалаў з Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР, як настаўніца фізікі Святлана Багдановіч і дырэктар першага ў Гомелі вучэбна-вытворчага камбіната сярэдніх школ Уладзімір Лайхтман: яго вучаніца Наталля Ждановіч, кандыдат навук, старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага інстытута цепла і масаабмену АН БССР, якая нядаўна прыслала свайму настаўніку цыкл артыкулаў, апублікаваных у Лондане. І надпіс на тытульным лісце: «Майму першаму настаўніку...»

Чытае сапрамат у Гомельскім філіяле БПІ вучаніца Мілеўскага, кандыдат навук Альбіна Клімовіч, нядаўна скончыў аспірантуру Мікалай Сінюк. А Саша Старастаў, былы начальнік школьнага СКБ, стаў добрым інжынерам-будаўніком, кіруе вытворча-тэхнічным аддзелам буйнога будаўнічага ўпраўлення.

Ды ці можна назваць усіх вучняў Мілеўскага? А вось ён памятае ўсіх. І ведае пра лёс кожнага.

Член партыі з 1944 года, чалавек высокіх маральных прынцыпаў, ён не церпіць ніякага праяўлення пошласці і мяшчанства. Пры ім адступаюць грубасць, неахайнасць у адзенні, у манерах, у думках. «Наша сумленне» — так называюць Мілеўскага ўсе, хто ведае яго.

Хвароба прымусіла Альбіна Іванавіча пайсці на пенсію. Але ён і не думае развітвацца са школай. Можна ж урэшце-рэшт і не працаваць настаўнікам. Але нельга Перастаць быць ім. І настаўнік Мілеўскі, як салдат, заўсёды ў страі. На яго пісьмовым стале — чарцяжы. тэхнічныя - часопісы, схемы, фатаграфіі. Прыходзяць да яго дадому яго вучні, яго таварышы-настаўнікі. І прыходзяць яны, скажам шчыра, не проста так, а дзеля таго, каб і параіцца з ім, і ўнесці ад яго эскіз арыгінальнай мадэлі, і сумесна рашыць задачу не толькі фізічнага, але і выха ваўчага харавтару.

Цяжкавата яму падоўгу гутарыць. Кажу яму:

— Альбін Іванавіч, вы б пайшлі пагуляць...

— А калі ў гэты час да мяне хто прыйдзе.

Хаця б такі, як вы... »

І добрыя вочы яго пры гэтым акаймляюцца сеткай дробных-дробных зморшчынак. І ўсмешка такая добрая, як тая, якую памятаю я яшчэ з тых даўніх часоў, калі вучыўся ў яго.

І твар яго дакладна такі, як на партрэце, што ўстаноўлены на цэнтральнай плошчы. Побач з партрэтамі славутага маршала і праслаўленага рабочага.

С. ГІНЗБУРГ, нам. дырэктара Гомельскай СШ № 34.